# СТВАРЭННЕ ЎМОЎ ВА ЎСТАНОВЕ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ ДЛЯ ВЫХАВАННЯ ЛЮБВІ ДА МАСТАЦКАГА СЛОВА Ў ВЫХАВАНЦАЎ СТАРШАЙ ГРУПЫ ПРАЗ АЎТАРСКІЯ КАЗКІ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

# CREATING OPPORTUNITIES IN A PRESCHOOL EDUCATION SYSTEM TO FOSTER LOVE OF THE ARTISTIC WORD AMONG THE PUPILS OF THE SENIOR GROUP THROUGH THE AUTHOR'S FAIRY TALES OF BELARUSIAN AUTHORS

**В. А. Аніськова, V. Aniskova**

Дзяржаўная установа адукацыі «Яслі-сад № 47 г. Магілева», Магілеў, Рэспубліка Беларусь

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны пытанням выхавання любві да мастацкага слова ў выхаванцаў старшай групы. Асаблівая ўвага звяртаецца на выкарыстанне аўтарскіх казак беларускіх пісьменнікаў, на выкарыстанне асноўных форм працы з выхаванцамі і іх бацькамі.

**Annotation.** The article is devoted to the issues of fostering love for the artistic word among the pupils of the senior group. Special attention is paid to the use of author's fairy tales by Belarusian writers, to the use of basic forms of work with pupils and their parents.

**Ключавыя словы:** мастацкая літаратура; казкі; гульні-драматызацыі; інсцэніраванне мастацкіх твораў; буктрэйлер.

**Key words:** fiction; fairy tales; dramatization games; animation of works of art; booktrailer.

Навучанню дзяцей роднай мове, авалоданню яе багаццем надаецца вялікая ўвага ў вучэбнай праграмме дашкольнай адукацыі. Родная мова з’яўляецца значным сродкам засваення дзецьмі культуры свайго народа, пачуцця нацыянальнай годнасці.

Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі ў адукацыйнай галіне «Мастацкая літаратура» выразна прапісвае рэкамендуемыя творы мастацкай літаратуры і фальклору: беларускія і рускія народныя песенькі і пацешкі; беларускія і рускія народныя казкі; казкі народаў свету; літаратурныя казкі; творы беларускіх, рускіх і замежных паэтаў; творы беларускіх, рускіх і замежных пісьменнікаў [3, 104].

Мастацкая літаратура з’яўляецца асноўным сродкам навучання дзяцей роднай мове, што падкрэслівае актуальнасць працы ў данным накірунку. Адным са шляхоў для вырашэння гэтай задачы з’яўляецца казка. Казка – найбагацейшы скарб, менавіта праз казку дзеці дакранаюцца да вытокаў роднай мовы, культуры і быту нашых продкаў. Усе гэтыя факты падштурхнулі да праекту “Аўтарскія казкі беларускіх пісьменнікаў” у старшай группе.

Тэарэтычнай базай гэтай працы з'яўляюцца метадычныя рэкамендацыі па азнаямленні дзяцей дашкольнага ўзросту з мастацкай літаратурай і фальклорам Д. М. Дубінінай (сістэма

заняткаў будуецца ў адпаведнасці з задачамі вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі) [1, 9].

На першым этапе былі сфармуляваны праблемы і мэты праекта, вызначаны прадукт праекта.

Задачы праекта пазначаны наступным чынам:

- развіваць у выхаванцаў цікавасць да твораў мастацкай літаратуры (аўтарскія казкі беларускіх пісьменнікаў); чуласць да прыгажосці і выразнасці мовы (эпітэтаў, апісанняў, вобразных слоў);

- фарміраваць у дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту ўяўленні пра спосабы стварэння творчага прадукта;

- выхоўваць у выхаванцаў старшай группы культуру чытання, любоў да мастацкага слова, эмацыянальна пазітыўнае стаўленне да твораў мастацкай літаратуры (аўтарскіх казкак беларускіх пісьменнікаў);

- спрыяць падтрыманню традыцыі сямейнага чытання.

Далей было вызначана кола твораў беларускіх пісьменнікаў і падабраны матэрыял і абсталяванне. Для гэтага створаны мультымедыйныя прэзентацыі па тэкстах казак беларускіх пісьменнікаў, лэпбук “Куфар казак беларускіх пісьменнікаў”.

Далучэнне дзяцей да вытокаў беларускай мастацкай літаратуры, вывучэнне роднай мовы немагчыма без паслядоўнай мэтанакіраванай работы з бацькамі. Таму на гэтым этапе з бацькамі прайшоў майстар-клас “Стварэнне буктрэйлера для дзяцей дашкольнага ўзросту” і круглы стол “Чытанне ў сям'і твораў беларускіх пісьменнікаў”, дзе бацькі высвятлялі не толькі веды дзяцей, але і сваі.

Дзеці старшага ўзросту ўжо здольныя да ўспрымання мастацкіх твораў розных жанраў. Асабліва іх цікавяць казкі. Чытанне казак беларускіх пісьменнікаў (В. Вітка “Вавёрчына гора”, Н. Ігнаценка “Казка пра Цімку і Кузьку”, Я. Колас “Два Маразы”, У. Дубоўка “Як сінячок да сонца лётаў”, В. Вітка “Страшная казка”, З. Бядуля “Скарб”, А. Дудараў “Сінявочка”) адбывалася штодзённа. Бацькі не парушалі гэтыя правілы і ў дні адпачынку.

Пасля чытання аўтарскай казкі выкарыстоўваліся наступныя прыёмы: змястоўныя зносіны па змесце твора, разглядванне ілюстрацый да казкі, слоўныя замалёўкі, паўторнае чытанне ўрыўкаў твора.

Далей адбылося аб'яднанне дзяцей у працоўныя групы. Праца ў мікрагрупах праходзіла па наступных накірунках:

- Тэатральная дзейнасць – самастойнае разыгрыванне казак, пастаноўка спектакляў з выкарыстаннем папяровых фігурак.

- Выразнае чытанне па ролях.

- Выяўленчая дзейнасць – маляванне па творах аўтарскіх казак беларускіх пісьменнікаў.

- Творчая дзейнасць сумесна з бацькамі па стварэнню буктрэйлераў па аўтарскім казкам беларускіх пісьменнікаў.

Для развіцця ў выхаванцаў творчых здольнасцей ім прапанаваліся наступныя заданні: выканаць з рознай інтанацыяй невялікую фразу з казкі (сумна, радасна, здзіўлена); сказаць невялікую фразу з рознай сілай голасу; прачытаць вершаваныя радкі казкі пэўным тонам і зададзенай тэмбравай афарбоўкай.

Акрамя гульні-драматызацыі, ва ўстанове дашкольнай адукацыі праводзіцца яшчэ і інсэніраванне мастацкіх твораў, якое ўяўляе сабой дакладнае і паслядоўнае адлюстраванне літаратурнага тэксту. Інсцэніраванне патрабуе спецыяльнага завучвання тэксту.

“Падчас завучвання вершаў на памяць, – падкрэслівае Д. М. Дубініна, – не толькі ўзбагачаецца лексічны запас слоў, але і фарміруюцца навыкі правільнага выкарыстання той ці іншай формы ў пэўнай маўленчай сітуацыі. Завучванне вершаў на памяць дапамагае дашкольнікам адпрацаваць навыкі правільнага выразнага вымаўлення гукаў, гукапераймання, слоў, словазлучэнняў” [1, 109].

Такая работа праводзілася па матывах вершаванай казкі В. Віткі “Вавёрчына гора”.

Цікавай формай з’явілася творчая дзейнасць бацькоў сумесна з дзецьмі па стварэнню буктрэйлераў па аўтарскім казкам беларускіх пісьменнікаў. Выхаванцы з бацькамі прымалі ўдзел у творчым працэссе. Непасрэдны працэс стварэння відэясюжетаў настолькі шматгранны, што кожны з выхаванцаў жадаў прымаць ўдзел у новай дзейнасці.

Атмасферны буктрэйлер па казцы “Вавёрчына гора”, які быў у нашых выхаванцаў першым, дапамог дзецям выказаць свае эмоцыі пасля чытання кнігі. Адбылося падвойнае ўваходжанне: спачатку настрой, створаны творам, прагаворваецца, пасля праігрываецца. Стварэнне роліка ўжо спрыяе развіццю цікавасці дзяцей да мастацкай літаратуры.

Наступным этапам праекту з’яўлялася яго прэзентацыя. Выхаванцы з захапленнем ўдзельнічалі ў музычна-літаратурнай імпрэзе “Вавёрчына гора” (паводле твора Васіля Віткі) і музычнай п’есе-казцы “Сінявочка” (па аднаіменным творы А. Дударава).

З гонарам і захопленнем дзеці – удзельнікі праекту дэманстравалі буктрэйлеры, створаныя с бацькамі і педагогамі, дзецям другой старшай группы.

Праца над творчым праектам “Аўтарскія казкі беларускіх пісьменнікаў” дала магчымасць атрымаць наступныя вынікі:

- Папаўненне бібліятэкі групы кнігамі беларускіх пісьменнікаў.

- Распрацоўка канспектаў заняткаў па тэме “Аўтарскія казкі беларускіх пісьменнікаў”.

- У выхаванцаў з’явілася цікавасць да твораў мастацкай літаратуры (аўтарскія казкі беларускіх пісьменнікаў).

- Сфарміраваны у дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту ўяўленні пра спосабы стварэння творчага прадукта.

- У выхаванцаў старшай группы з’явілася эмацыянальна пазітыўнае стаўленне да твораў мастацкай літаратуры (аўтарскіх казак беларускіх пісьменнікаў).

- У семьях выхаванцаў з’явіліся  традыцыі сямейнага чытання.

Як падкрэслена  выкладчыкам Гродненскага дзяржаўнага педагагічнага каледжа А. І. Красіла, “нельга вывучыць родную мову пад прымусам, яна павінна ўвайсці ў сэрца і думкі дзяцей непрыкметна, лёгка” [2, 6]. А для гэтага выхавальніку дашкольнай адукацыі неабходна спалучаць разнастайныя формы работы з выхаванцамі.

### *Список использованных источников*


1. Дубініна, Д. М. Выхаванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту цікавасці да беларускай мастацкай літаратуры і фальклору: дапам. для педагогаў ўстаноў дашк. адукацыі / Д. М. Дубініна. – Мінск : Новое знание, 2016. – 208 с.
2. Красіла, А. І. Праз літаратурную спадчыну – да авалодвання роднай мовай: дапам. для выхавальнікаў дзіцячых садоў / А. І. Красіла. – 2-е выд. – Мазыр : ТАА ВД “Белы Вецер”, 2003. – 72 с.
3. Учебная программа дошкольного образования / Министерство образования Республики Беларусь. – Минск : Нац. ин-т образования, 2019. – 416 с.